УДК 882.6.09-2

І.Л. ДАНІЛЕНКА

ЛЕКСІЧНА-СЕМАНТЫЧНЫЯ І ЛЕКСІЧНА-СТЫЛІСТЫЧНЫЯ СРОДКІ ВЫРАЖЭННЯ КАМІЧНАГА Ў МОВЕ ПЕРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ЧАСОПІСА "ВОЖЫК")

Мэтай артыкула з'яўляецца вызначэнне і апісанне найбольш тыповых лексічна-семантычных і лексічна-стылістычных сродкаў стварэння камічнага эфекту ў мове часопіса "Вожык" (на матэрыяле выданняў 1996 – 2000 гг.).

У мове перыядычнага друку сустракаюцца ўсе вядомыя лексічныя сродкі камічнага, але не ўсе яны, па-першае, аднолькава значныя, па-другое, прадстаўлены вызнача-

нымі разнавіднасцямі, а па-трэцяе, маюць тыя ж самыя функцыі, што ў мастацкіх і драматургічных тэкстах.

У мове часопіса "Вожык" лексічна-семантычнымі сродкамі камічнай экспрэсіі з'яўляюцца сінонімы і антонімы, якія могуць быць або узуальнымі (пры гэтым у прамым значэнні ўжываюцца вельмі рэдка), або індывідуальна-маўленчымі (аказіянальнымі).

Лексічна-стылістычныя сродкі стварэння камічнага эфекту – гэта найперш стылістычна зніжаная лексіка (гутарковая і прастамоўная, а таксама стылістычна нейтральныя словы, якія ўжываюцца з адценнем прастамоўнасці), дыялектызмы (фанетычныя, словаўтваральныя, марфалагічныя і вельмі рэдка – лексічныя), жарганізмы і іншамоўныя ўкрапіны (з англійскай, лацінскай, нямецкай, рускай і французскай моў).

Лексічныя сродкі стварэння камічнай экспрэсіі ў беларускай літаратурнай мове вызначаны і апісаны на матэрыяле драматургічных твораў і падзяляюцца на сінонімы (найчасцей індывідуальна-маўленчыя, семантычна або экспрэсіўна кантрастныя), антрапонімы ("гаваркія" прозвішчы, імёны, мянушкі), лексічныя аказіяналізмы (пабудаваныя як па тыповых, так і нетыповых, спецыфічных мадэлях), словы з незразумелым для персанажа значэннем (у асноўным іншамоўныя), дыялектызмы (фанетычныя, лексічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя), стылістычна зніжаная лексіка (прастамоўныя словы) [2, с. 151-173].

У мове перыядычнага друку сустракаюцца ўсе з пералічаных вышэй лексічных сродкаў камічнага, але не ўсе яны, па-першае, аднолькава значныя, па-другое, прадстаўлены вызначанымі разнавіднасцямі, а па-трэцяе, маюць тыя ж самыя функцыі, што ў мастацкіх і драматургічных тэкстах.

Лексічныя сродкі камічнага можна падзяліць на ўласна лексічныя [1], лексічна-семантычныя і лексічна-стылістычныя.

Мэтай артыкула з'яўляецца вызначыць і апісаць найбольш тыповыя лексічна-семантычныя і лексічна-стылістычныя сродкі стварэння камічнага эфекту ў мове часопіса "Вожык" (на матэрыяле выданняў 1996 – 2000 гг.).

1. Лексічна-семантычныя сродкі выражэння камічнай экспрэсіі – гэта сінонімы і антонімы, якія могуць быць або узуальнымі (адносна не залежаць ад кантэксту), што ўжываюцца для выражэння камічнага зместу ў прамым значэнні вельмі рэдка, або (найчасцей) індывідуальна-маўленчымі (аказіянальнымі), асаблівасці ўжывання якіх абумоўлены пэўным кантэкстам, яны выходзяць за межы лексічна-семантычнай сістэмы мовы і не фіксуюцца ні тлумачальнымі слоўнікамі, ні спецыяльнымі даведнікамі (сінонімаў, антонімаў) [3; 4].

1.1. Сінонімы, якія размяжоўваюцца на:

а) узуальныя (пераважна уласна беларускія і іншамоўныя адзінкі): *Пасля таго як святы айцец Канстанцін адлучыў яго ад царквы за любоў да Бахуса, ці папросту п'янства, Корань перакваліфікаваўся з царкоўнага старасты ў свіняча-трусяча-пеўневага* ***забойцу****, ці, як цяпер па-культурнаму кажуць,* ***кілера****.* (1999, № 7, с. 11). *Прэзідэнт Саўка Аўхімаў апошнім указам дараваў нам высокі статус* ***ільготнікаў****, прасцей кажучы,* ***бенефіцыяраў****. І мы павінны сёння ўжо карыстацца* ***прывілеямі****, як кажуць на дзяржаўнай мове,* ***прэферэнцыямі****.* (1996, № 1, с. 6);

б) аказіянальныя: *Не забывайцеся, што вы* [Леў] – ***цар*** *звяроў,* ***прэзідэнт****, можна сказаць. А дзе ж доблесная каманда і шасцісоты "Мерседэс"?* (1999, № 2, с. 13). *У яе* [ВАК Вожыка] *увайшлі самыя* ***заслужаныя****, самыя* ***лысыя****, адным словам, самыя* ***галавастыя*** *людзі.* (1998, № 12, с. 10). – *Вось бы знайсці зелле мне – ад* ***бяспамяцці****, а ёй* [жонцы] – *для* ***забыцця****.* (1998, № 2, с. 3). *Хопіць* ***мяккацеласці, размытасці, інтэлігентшчыны!*** (1996, № 8, с. 3).

1.2. Антонімы, якія падзяляюцца на:

а) узуальныя: *Слоў у адказ* ***многа****, а прычына* ***адна*** *– няма грошай.* (1999, № 10, с. 3). *Адзін з гасцей дае Вовачку цукерку і кажа: – Я ехаў каля лесу, і*

маленькі *зайчык перадаў табе гэты гасцінец. Вовачка падумаў і папытаў: – А* ***вялікі*** *мядзведзь мне нічога не перадаваў?* (1998, № 12, с. 13). *Прыйшлі госці. Адзін з іх вітаецца з Сярожам: – Прывітанне,* ***малады*** *чалавек! – Прывітанне-прывітанне,* ***стары*** *дзядька, – адказвае малы.* (1998, № 12, с. 13). *Зраблю* ***святочны*** *салют у* ***будзённыя*** *дні.* (1998, № 9, с. 2). ***Дурныя*** *людзі любяць вучыцца, а* ***разумныя*** *выкладчыкі зарабляюць на гэтым грошы.* (2000, № 9, с. 9). *Мужчына з* ***цяжкім*** *характарам шукае жанчыну* ***лёгкіх*** *паводзін.* (2000, № 7, с. 14).

б) аказіянальныя: *"****Галавой*** *думаць трэба" – надпіс на* ***заду*** *нейкага чыноўніка.* (1999, № 1, с. 3). ***Фізічна*** *я вельмі развіты хлопец. А вось* ***лірычна*** *– не вельмі.* (1999, № 1, с. 11). *Віншую вас, віншую! З чым? Ну ведама з чым: мінуў ужо месяц, як вы з* ***брыдкага абітурыента*** *ператварыліся ў* ***прыстойнага студэнта****.* (1999, № 10, с. 11).

2. Лексічна-стылістычныя сродкі камічнага – гэта стылістычна зніжаная лексіка, дыялектызмы, жарганізмы, іншамоўныя ўкрапіны.

2.1. Стылістычна зніжаная лексіка з'яўляецца адным з самых дзейсных лексічных сродкаў выражэння камічнага і прадстаўлена ў мове беларускага перыядычнага друку гутарковымі і прастамоўнымі адзінкамі, а таксама выпадкамі ўжывання стылістычна нейтральных слоў з адценнем прастамоўнасці дзякуючы кантэкстуальна абумоўленаму пераноснаму значэнню або нязвыклай граматычнай форме (словаўтваральным ці словазмяняльным афіксам).

2.1.1. Гутарковая лексіка – словы вуснага маўлення з адценнямі іроніі, жарту, знявагі або эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкай: *На адну бутэльку прас выменяла, праўда, ручка адбітая, але мне* ***мальцы*** *тут жа і заматалі ізалентай – прасціць.* (1996, № 2, с. 11). *Неўзабаве недаростак* ***дакумекаў****, што аўтамашыны "****чысціць****" аднаму і сумнавата, і небяспечна, трэба нейкі кагал сабраць.* (1999, № 4, с. 13). *Алена Фядосаўна: – Ну і артыст ты, Андрэй! Гарэлку* ***выжлукціў****, каўбасу* ***ўмяў****. А толку?* (1999, № 4, с. 6). *Ён піў і піў. І час настаў – Так* ***насцябаўся****, што не ўстаў. У пекле, мабыць, на пахмелле З чарцямі* ***глушыць*** *злое зелле.* (1999, № 4, с. 6). *І атрымалася так, што зрабілі мяне прысядацелем. Адпіраўся я, не хацеў, але "****запраглі****".* (2000, № 2, с. 6). ***Прыпёрся*** *цягніком. А з Масквы да Ташкента – самалётам. Тут мяне і* ***прышчучылі****.* (2000, № 3, с. 5). *За кароткі тэрмін у Калодзішчах ён* ***абчысціў*** *некалькі легкавых аўтамабіляў. Мажліва, гэткім адзінокім "чысцільшчыкам" аўтамашын Аляксей Цітоў і застаўся б, каб не папаўся на чарговай аперацыі і сеў на вядомую лаву.* (1999, № 4, с. 13).

2.1.2. Прастамоўная лексіка ўжываецца з мэтай зніжанай ацэнкі прадмета гаворкі (з адценнем знявагі, пагарды, неадабрэння і да т. п.): – ***Жары****, каб ты падавілася!* (1999, № 2, с. 8). *Так табе і трэба, зараза, не канчай інстытуты, не сноўдайся па рэстаранах, а сядзі сабе на лавачцы і назірай, як бегаюць тудысюды людзі. І чаго яны,* ***падлы****, так мітусяцца?* (1996, № 2, с. 7). *Не паспелі за куфлі ўзяцца, як да нас нейкі мужык* ***падлабуніўся****.* (2000, № 6, с. 5). ***Пашвэндаўшыся*** *па рынках, прафесійным вокам прыкінуўшы рэальную сённяшнюю сітуацыю, ён рашыў перш за ўсё ажыццявіць абмазгаваную ў прынцыпе яшчэ на турэмных нарах аперацыю "квартэт".* (2000, № 6, с. 4). *Пад балдою дзядзя Ваня Гуманоіда зварганіў. Гуманоід, як падрос, Гэткі ж самы стаў* ***п'янтос****.* (2000, № 7, с. 9). *Беспрацоўная настаўніца Разумнікава Галіна Пятроўна выпадкова сустрэла на біржы працы свайго былога вучня Ваську – несусветнага шалапута,* ***гультая, бэйбуса****.* (2000, № 7, с. 2). *– Во дзе* ***жытуха*** *была! Работы не густа, і кантроль – так сабе. Выканаў заданне і гуляй, Вася.* (2000, № 1, с. 12).

2.1.3. Стылістычна нейтральная лексіка можа ўжывацца з адценнем прастамоўнасці, якое ўтвараецца дзякуючы наступным прычынам:

а) кантэкстуальна абумоўленаму пераноснаму значэнню слова, якое надае зніжаную ацэнку прадмету гаворкі: *Дык браты гэтай* ***малпы*** *пагражаць мне сталі. – Круцялькоў крыху памаўчаў і працягваў: – Словам, яны мяне, як таго бычка, за рогі – у ЗАГС. А потым сынок з'явіўся на свет. Ды не змог я з гэтай* ***малпай*** *жыць. Вось і даў лататы, куды вочы глядзяць. Жыў* ***сабакам****, бегаў з месца на месца.* (1997, № 7, с. 6). Тут адценне прастамоўнасці набываюць лексемы *малпа* ('непрыгожы або благі чалавек, звычайна жанчына') і *сабака* ('бяздомны, неўладкаваны чалавек'), адзначаныя пераносныя значэнні якіх не фіксуюцца ў тлумачальным слоўніку беларускай мовы [5];

б) нязвыклай граматычнай форме слова (ужыванню прастамоўных словаўтваральных ці словазмяняльных афіксаў): *Скажы, дзядзька Міхей, колькі часу ў цябе працягваецца акт, – задаваў пытанне які-небудзь* ***слесаруга****, асалавелы ад самагону.* (1997, № 11, с. 9). Лексема *слесар* ужываецца тут у неўласцівай ёй форме *слесаруга* паводле мадэлі *звер – звяр-****уг****-а*.

2.2. Дыялектызмы як сродак стварэння камічнага эфекту ў мове перыядычнага друку (паводле часопіса "Вожык") ужываюцца фанетычныя, словаўтваральныя, марфалагічныя і вельмі рэдка – лексічныя: *На адну бутэльку прас выменяла, праўда, ручка адбітая, але мне мальцы тут жа і заматалі ізалентай –* ***прасціць****. На дзве бутэлькі слоічак мёду прынеслі – гэта ад жонак-дзяцей крадуць* ***каголікі****.* (1996, № 2, с. 11). *Шэсцьдзесят* ***кіль****, таварыш Караблёў! – казыраю яму па-ваеннаму.* (1998, № 9, с. 11). *Пайшлі касманаўты па* ***мястох****, а ракеты – цю-цю!... Прыйшлі, значыцца, ракету забіраць, а* ***хадзяін*** *кажа: "Сама на двор упала!"* (1998, № 9, с. 11). *Варта было Іллюку ў першы дзень знаёмства прызнацца, што быў колісь старшынёй калгаса, ці, як ён, хітравата жмурачы вока, казаў "****прысядацелем****", як мянушка імгненна прыліпла да новенькага.* (2000, № 2, с. 6).

2.3. Жарганізмы – лексічныя адзінкі з умоўнай гаворкі якой-небудзь сацыяльнай групы, адлюстроўваюць патрэбы і густы яе прадстаўнікоў: *Ачомаўшыся трохі ад лагернай баланды, скіраваў лыжы ў стольны град. Пашвэндаўшыся па рынках, прафесійным вокам прыкінуўшы рэальную сённяшнюю сітуацыю, ён рашыў перш за ўсё ажыццявіць абмазгаваную ў прынцыпе яшчэ на турэмных нарах аперацыю "квартэт". Для аперацыі патрэбны памочнікі –* ***чувіха*** *і два* ***чувакі****, а яшчэ –* ***ксіва*** *(дакументы).* (2000, № 6, с. 4).

2.4. Іншамоўныя ўкрапіны – гэта словы і выразы з якой-небудзь мовы, якія ўжываюцца білінгвам у нязменнай або транслітараванай форме з пэўным стылістычным заданнем і не належаць сістэме мовы-рэцыпіента. У мове перыядычнага друку сустракаюцца пераважна частковыя іншамоўныя ўкрапіны, да якіх адносяцца словы, у той або іншай ступені асвоеныя беларускай мовай.

Асноўнымі мовамі-крыніцамі іншамоўных украпін у часопісе "Вожык" з'яўляюцца наступныя мовы:

а) англійская: *Пакуль што і Марадона, і Мухамед Алі, і нават міністр Рыжанкоў не змаглі прымерыць суперсучасную спартыўную форму з надпісам: "****Мэйд ін Грэнд*** *Бераставіца".* (1996, № 10, с. 3). *Давайце музыку ў* ***кайф*** *– і ўсё будзе* ***а'кей****! Ну і ўсё.* ***Гуд бай****!* (1998, № 9, с. 6);

б) лацінская: *Колькі* [Ул. Лазараў] *плаціў за тое збожжа, колькі меў* ***спірытусу-віні****, каму яго збываў, якую меў выручку – нічога не памятае.* (1997, № 6, с. 4);

в) нямецкая: *І раптам у тры гадзіны ночы "****аўфштэен****".* (1996, № 11, с. 2). *Дырэктар акцыянернага таварыства "Лота М" А. Алейнік даў аб'яву ў газеце аб тым, што афармляе візы ў Германію. За кароткі тэрмін сабраў 20 тысяч даляраў і сказаў Мінску: "****Аўфвідэрзэен****", – карацей кажучы, даў лататы.* (1997, № 4, с. 6). *Я кідаю гэты магутны нявыкарыстаны патэнцыял на вашу хваробу – і яна робіць* ***хэндэ хох****.* (1997, № 8, с. 4);

г) руская: *Не забывайцеся, што вы* [Леў] – *цар звяроў, прэзідэнт, можна сказаць. А дзе ж* ***доблесная*** *каманда і шасцісоты "Мерседэс"?* (1999, № 2, с. 13). *А з торбы вымаюць тры бутэлькі "Імперыялу" – любімага напою майго знаёмага, два боханы хлеба ды яшчэ блок цыгарэтаў танных, што на камароўцы прыдбаў. – Кантрабанда!* ***Шчас*** *пратакол саставім* ***аб із'яцці.*** (1999, № 4, с. 2).

д) французская: *І прамовіў па-французску: –* ***Се ля ві****!... І іншамарка Знікла шпарка, быццам хмарка.* (1998, № 6, с. 9).

Такім чынам, вызначаныя лексічныя сродкі выражэння камічнага ў мове беларускага перыядычнага друку (на матэрыяле часопіса "Вожык") можна падзяліць на два тыпы: лексічна-семантычныя і лексічна-стылістычныя. Да лексічна-семантычных адносяцца сінонімы і антонімы, якія могуць быць або узуальнымі (пры гэтым у прамым значэнні ўжываюцца вельмі рэдка), або індывідуальна-маўленчымі (аказіянальнымі). Лексічна-стылістычныя сродкі стварэння камічнага эфекту – гэта стылістычна зніжаная лексіка, дыялектызмы, жарганізмы і іншамоўныя ўкрапіны.

ЛІТАРАТУРА

1. ***Даніленка, І.Л.*** Уласна лексічныя сродкі выражэння камічнага ў мове беларускага перыядычнага друку (на матэрыяле часопіса "Вожык") / І.Л. Даніленка // Веснік Магілёўскага дзярж. ун-та імя А.А. Куляшова. – 2007. – № 1 (26). – С. 150-153.
2. ***Рагаўцоў, В.І.*** Маўленчае выражэнне камічнага ў беларускай драматургіі / В.І. Рагаўцоў. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2002. – 304 с.
3. ***Рагаўцоў, В.І.*** Сінонімы як сродак стварэння камічнага эфекту ў беларускай драматургіі / В.І. Рагаўцоў // Весці Беларускага дзярж. пед. ун-та. – 2000. – № 2 (24). – С. 34-39.
4. ***Рагаўцоў, В.І.*** Антонімы як сродак выражэння камічнага (на матэрыяле беларускай драматургіі) / В.І. Рагаўцоў // Веснік Магілёўскага дзярж. ун-та імя А.А. Куляшова. – 2000. – № 2-3 (6). – С. 105-110.
5. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / Пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. – Мн.: БелЭн, 1996. – 784 с.

Паступіў у рэдакцыю 20.04.2007 г.